Семантызацыя ў лінгвістычнай тэрмінаграфіі

ЛЕКСІКАГРАФІЯ, ДЭФІНІЦЫЯ, ПАРАМЕТРЫЗАЦЫЯ, МЕТАЛІНГВІСТЫЧНЫ КАНТЫНУУМ, ЛЕКСІКАГРАФІЧНЫ КОРПУС, ЛЕКСІКАГРАФІЧНАЯ ПРЭЗЕНТАЦЫЯ, НАМІНАТАР, ХАРАКТАРЫЗАТАР

Семантызацыя ў лінгвістычнай тэрмінаграфіі [Тэкст]: Справаздача аб НДР (заключ.): / БДПУ; кіраўн. Дзятко Д.В. - Мн., 2021. - 86 с., - Бібліягр.: С. 80-86 (56 назв.). - № ДР 20211326.

**Аб'ект даследавання** – сістэма лінгвістычных тэрмінаў ва ўсходнеславянскай лексікаграфіі.

**Мэта даследавання** – распрацаваць тыпалогію лексікаграфічных і метатэкставых дэфініцый у беларускіх слоўніках лінгвістычных тэрмінаў.

Асноўным **метадам** даследавання з'яўляецца апісальны метад сінхроннага аналізу з элементамі дыяхраніі, выкарыстоўваюцца асобныя прыёмы параўнальнага метаду і кампанентнага аналізу.

**Вынікі работы**: распрацавана тыпалогія лексікаграфічных і метатэкставых дэфініцый у беларускіх слоўніках лінгвістычных тэрмінаў.

**Рэкамендацыі па ўкараненні** вынікаў НДР. Матэрыялы праведзеных даследаванняў рэкамендаваны да выкарыстання ў адукацыйнай сферы пры выкладанні дысцыплін «Сучасная беларуская літаратурная мова», «Беларуская лексікаграфія», «Гісторыя беларускай мовы», «Гісторыя беларускага мовазнаўства», распрацоўцы і чытанні спецкурсаў, напісанні вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ і вучняў агульнаадукацыйных устаноў, дыпломных і магістарскіх работ, падрыхтоўцы дысертацыйных даследаванняў.

**Навуковая і практычная значнасць** атрыманых вынікаў заключаецца ў тым, што ўпершыню ў беларускім мовазнаўстве распрацаваны фрагмент зыходнай тэарэтычнай канцэпцый сістэмнай параметрызацыі і кадыфікацыі спецыяльнай лексікі ва ўсходнеславянскіх тэрміналагічных слоўніках (на матэрыяле лінгвістычнай металексікаграфіі).